Беларусы! Карыстайцеся паслугамі ТАА «Солумекс»!
Гэты нумар зьявіўся ў сьвет, дзякуючы падтрымцы ТАА «Солумекс».

# ARCHE 4(9)–2000

## Аналітыка • Эсэістыка • Крытыка • Рэцэнзіі

## ЗЬМЕСТ


**3 Валерка Булгакаў: Дэклясаваная эліта**

**18 Юлія Андрэева: Сьвятарная худоба на музычным траўніку**

**32 Уладзімер Роўда: Расія і свабода**

**51 Анджэй Карашэўскі: Паміж багацьцем і беднасьцю**

**58 Алег Гардзіенка: Гісторык, які перайграў гісторыю**

**71 Кнігі — Рэакцыі — Лісты ў рэдакцыю**

71 Сяргей Харэўскі: Цэрквы з дрэва
72 Генадзь Туровіч: Радзівілаўскія конікі
75 Вольф Рубінчык: Яшчэ пра Галакост
76 Ганна Штэйнман: У дзяржаўніцкіх каардынатах
77 Наста Гулак: Трывожнае ўспрыманьне рэчаіснасьці



**ARCHE-SKARYNA on-line:**
http://arche.home.by (для карыстальнікаў у Беларусі)
http://arche.itgo.com (для карыстальнікаў за межамі Беларусі)

**Часопіс ARCHE выходзіць штомесяц.**
**Выдаецца з 1998 году.**



Рэдакцыйная калегія:
Уладзімер Адамчык — *мастацкі рэдактар*
Аляксандра Андрыеўская — *намесьніца галоўнага рэдактара*
Валерка Булгакаў — *галоўны рэдактар*
Юрась Бушлякоў — *адказны сакратар*
Андрэй Вашкевіч — *дызайн*
Андрэй Дынько — *дырэктар*
Віялета Кавалёва — *карэктарка*
Алена Казлова — *сакратарка рэдакцыі*
Максім Капран — *web-дызайнэр*
Анатоль Прасаловіч — *рэдактар*
Андрэй Скурко — *распаўсюднік*
Сяржук Сматрычэнка — *карэктар*



*Адрас для допісаў:* 220018, Менск-18, а/с 3, ARCHE.
*E-mail:* arche@arche.org.by
*Тэл.:* (017) 257-48-69.



*Заснавальнік:* Андрэй Дынько.
Пасьведчаньне аб рэгістрацыі №1184.
*Юрыдычны адрас:* 220029, Менск, вул.Кісялёва, 7-54.

# Аўтары

**ВАЛЕРКА БУЛГАКАЎ**
галоўны рэдактар часопіса ARCHE, аўтар эсэ „Мой Багушэвіч. Дыялектыка клясычнага тэксту“ (1998). Апошняя ягоная публікацыя — артыкул „Каляндарык для кастрата“ ў мінулым нумары ARCHE-СКАРЫНЫ.

**ЮЛІЯ АНДРЭЕВА**
кампазытарка, музычны крытык, выкладчыца Беларускага Калегіюму. Сярод апошніх значных публікацыяў — артыкул *Losy opery białoruskiej* у польскім часопісе *Ruch muzyczny* (Варшава, 1998).

**УЛАДЗІМЕР РОЎДА**
палітоляг, кандыдат філязофскіх навук, выканаўчы дырэктар інфармацыйна-аналітычнага аддзелу Асамблеі Няўрадавых Арганізацый Беларусі. Укладальнік кнігі „Да дэмакратыі праз грамадзянскую супольнасьць“ (Шчэцін, 1999).

**АНДЖЭЙ КАРАШЭЎСКІ**
польскі публіцыст, сталы аўтар часопіса *Kultura*.

**АЛЕГ ГАРДЗІЕНКА**
асьпірант Інстытуту гісторыі НАН Беларусі, стваральнік альманаху *Historica*. Сталы аўтар газэты „Наша Ніва“.

---

Беларускі мастак, літаратар, мастацтвазнаўца і біёляг Сяргей Харэўскі злучыў пад адной вокладкай знакамітыя тэксты, што друкаваліся на пачатку 90-х у віленскай газэце „Наша Ніва“ пад рубрыкай „Вось сымбаль твой...“. Уладзімер Арлоў у прадмове да кнігі піша:

*„Пра якую б родную нам істоту ні апавядала таленавітае пяро С.Харэўскага... перад чытачом нязьменна паўстаюць жывакроўныя, псыхалягічна дакладныя вобразы крылатых, хвастатых альбо нават падводных суайчыньнікаў, якія, на вялікі жаль, пакуль пазбаўленыя права голасу.*




*Сяргей Харэўскі*
*Зьвяры-суайчыньнікі*
*Менск*
*Наша Ніва*
*2000*

*Аўтар спакваля вядзе нас да канцэптуальнай высновы пра тое, што пэўныя віды прадстаўнікоў нашай фаўны ў розныя пэрыяды гісторыі выяўлялі ляяльнасьць і нават прыхільнасьць да ўласнай нацыянальнай улады... і пакідалі абсягі Беларусі, не жадаючы мірыцца з акупацыйнай адміністрацыяй...*

*Варта дадаць, што ў навуцы апісаныя выпадкі ня толькі пасіўнага, але й актыўнага супраціву акупантам з боку айчынных зьвяроў і птушак. Гістарыёграфы Слуцкага збройнага чыну ведаюць, да прыкладу, пра вельмі пасьпяховы напад аддзелу з 10—12... расамахаў (Gulo gulo) на бальшавіцкага камісара і двух ягоных ардынарцаў, зьдзейсьнены ў ваколіцах Семежава, што ў цяперашнім Капыльскім раёне. (На месцы акцыі нядаўна ўсталяваная мэмарыяльная стэла.)*

*У гістарычных крыніцах знойдзеныя й зьвесткі аб супрацоўніцтве ўжо рэдкіх на той час дрохваў (Otis tarda) з фармаваньнямі генэрала Булак-Балаховіча ў справе дывэрсіяў на кантраляваных бальшавікамі палескіх чыгунках. Акурат пасьля аднаго з удалых выхадаў на „жалезку“, калі ў раёне Петрыкава быў зьнішчаны вайсковы эшалён з тэхнікай, ГПУ й наладзіла карную экспэдыцыю, у ходзе якой піцерскі рабочы Біндзюжнікаў расстраляў апошнюю бачаную ў Беларусі драхву, вядомую балахоўцам пад любоўнай мянушкай Маня.*

*Згаданыя факты лішні раз сьведчаць, што эўрапейская будучыня Бацькаўшчыны станецца магчымаю адно ў выніку яднаньня ўсіх дэмакратычных сілаў нашага грамадзтва са здаровымі, нацыянальна арыентаванымі сіламі беларускае прыроды. Лепшыя старонкі кнігі Сяргея Харэўскага прасякнутыя сьветлай верай у непазьбежнасьць гэтага пераможнага альянсу“.*

Па пытаньнях набыцьця гэтай кнігі, цікавай і для дзяцей, і для дарослых, выдадзенай, на жаль, мізэрным накладам 300 асобнікаў, зьвяртайцеся ў рэдакцыю газэты „Наша Ніва“ або на e-mail: chareuss@kraj.org.